НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі

МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

# ТВОРЧАСЦЬ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*да 120-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры*

(Мінск, 25-26 лістапада 2011 года)

Мінск
"Права і эканоміка"
2011

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

Інстытут мовы і літаратуры
імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі

# ТВОРЧАСЦЬ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі
да 120-годдзя з дня нараджэння
Максіма Багдановіча

*(Мінск, 25–26 лістапада 2011 года)*

Мінск
"Права і эканоміка"
2011

УДК 821(4) + 821.161.3.09 (092) Багдановіч
ББК 81.2
Т28

Рэдакцыйная калегія:
Манкевіч А.А. *(укладальнік)*, Баўтрэль І.Г., Дубашынскі Р.Ю.,
Дудзінская Дз.І.-Т., Драздова З.У., Лапата-Загорскі А.М., Пыско Н.М.,
Пякуцька-Вабішчэвіч Т.І., Чарота У.І., Шаладонаў І.М.

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі С.С. Лаўшук,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт БДУ М.П. Кенька

Т28 **Творчасць** Максіма Багдановіча ў кантэксце сусветнай літаратуры : матэрыялы Міжнар. навук. канферэнцыі (да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча), Мінск, 26–26 ліст. 2011 г. / Ін-т. мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нац. акадэміі навук Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2011. – 242 с.
ISBN 978-985-552-022-2.

У зборнік увайшлі матэрыялы навуковых даследаванняў, прадстаўленых удзельнікамі Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Творчасць Максіма Багдановіча ў кантэксце сусветнай літаратуры", прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры (25–26 лістанада 2011 года). У кнізе асвятляюцца актуальныя пытанні літаратуразнаўства, мовазнаўства, паэтычная, празаічная і публіцыстычная спадчына Максіма Багдановіча, яго перакладчыцкая дзейнасць, а таксама традыцыі паэта ў беларускай паэзіі XX ст. і найноўшым літаратурным працэсе.

Зборнік адрасуецца спецыялістам у галіне славянскай філалогіі, аспірантам і студэнтам філалагічных спецыяльнасцяў.

**УДК 821(4) + 821.161.3.09 (092) Багдановіч**
**ББК 81.2**

**ISBN 978-985-552-022-2**

© ДНУ "Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі", 2011
© Оформление. ИООО "Право и экономика", 2011

*Н.М Базар. (Мінск)*

# СУЧАСНАЕ БАГДАНОВІЧАЗНАЎСТВА – ШКОЛЕ

Перш чым вызначыць набыткі той галіны беларусазнаўства, якая звязана з жыццём і творчасцю М. Багдановіча і якая можа быць выкарыстана ў сярэдняй школе, акрэслім асноўныя параметры сучаснага багдановічазнаўства. Найперш яго прадстаўляе дзейнасць калектыву Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, якая звязана са стварэннем унікальнага цэнтра, прысвечанага беларускаму песняру, з арганізацыяй і правядзеннем навуковых канферэнцый, форумаў, выстаў і інш. Сучаснае багдановічазнаўства – гэта даследаванні беларускіх літаратуразнаўцаў, прысвечаныя жыццю і творчасці М. Багдановіча (Н. Ватацы, М. Грынчык, А. Кабаковіч, У. Конан, А. Лойка, М. Стральцоў, Л. Тарасюк, П. Абрамовіч, Г. Адамовіч, П. Васючэнка, Я. Гарадніцкі, А. Данільчык, Т. Кабржыцкая, Т. Кароткая, М. Кенька, Г. Кісліцына, В. Козіч, Е. Лявонава, В. Максімовіч, Т. Мацюхіна, Ю. Пацюпа, Л. Сінькова, А. Трафімчык, М. Трус і інш.). Набыткі сучаснага багдановічазнаўства пашырае праца рэдакцый часопісаў («Беларуская мова і літаратура», «Дзеяслоў», «Маладосць», «Полымя», «Роднае слова»), газет («Звязда», «Культура», «Літаратура і мастацтва», «Настаўніцкая газета»), выдавецтваў, якія збіраюць, рыхтуюць да выдання творы паэта, друкуюць навуковыя працы, прысвечаныя яму («Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», «Мастацкая літаратура», «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», выдавецкія цэнтры ВНУ і інш.). Сучаснае багдановічазнаўства – гэта таксама праца педагогаў ВНУ і сярэдніх агульнаадукацыйных устаноў Беларусі, тых, хто выкладае, папулярызуе творчасць Багдановіча, перадаючы ў спадчыну новым пакаленням любоў і павагу да класіка беларускай літаратуры.

Жыццёвы і творчы шлях М. Багдановіча, асобныя яго вершы вывучаюць у малодшых (I–IV), сярэдніх (V–IX) і старшых (X–XI) класах. Хоць «школьная праграма забяспечвае ў асноўным толькі фрагментарныя веды» [7, с. 42], гэтага дастаткова для знаёмства вучняў з мастацкай спадчынай паэта, бо, як бы ні хацелася, але немагчыма цалкам ахапіць у школьным навучанні ўсе моманты яго творчасці. Вывучэнне літаратурнай спадчыны М. Багдановіча ў школе пачынаецца з урокаў пазакласнага чытання ў пачатковых класах. Настаўнік расказвае дзецям ключавыя моманты жыцця паэта, рыхтуе выставу кніг з яго творамі. Мэтазгодна пачаць знаёмства з паэмы-казкі М. Багдановіча «Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык», у якой «і дарослых, і дзяцей найперш прываблівае атмасфера казачнасці, весялосці, гумару, цікавыя звесткі з жыцця, абрадаў, звычаяў, побыту нашага народа ў мінулым» [11, с. 186].

Варта як мага часцей праводзіць конкурсы малюнкаў да твораў паэта ці выкарыстоўваць яго вершы на ўроках выяўленчага мастацтва. Пад уражаннем ад пачутых радкоў дзеці на паперы ствараюць такія ж «бахматыя, сіняватыя, дрыжачыя, пахаладзеўшыя, пуцяводныя, пекныя, маленькія, мілыя, сінія, ясныя, цёмныя зоры» [1, с. 43], якія бачыў і аднаўляў у сваёй паэзіі М. Багдановіч. Вучні малююць месяц, падобны на «серп, круглы рог …як чытаем у вершах Максіма-жывапісца» [1, с. 44], мяцеліцу, што «гудзіць, гуляе, шуміць» [1, с. 47], «балота», дзе «ржаўчына ляжыць як пазалота»... Нават у брудзе лужын адбіваецца

хараство – зоркі. Няма агіднага ў прыродзе...» [1, с. 46]. Захапленне паэта прыгажосцю прыроды не можа не паўплываць на чытача, вучня. Дзеці, абапіраючыся на слоўныя малюнкі Багдановіча, спрабуюць ствараць свае карціны. Так, дзякуючы мастацтву паэта, яго ўменню дакладна перадаць пэўную з'яву прыроды, даць характарыстыку прыродным аб'ектам, стварыць непаўторнае ўражанне ад родных краявідаў, у маленькіх беларусаў з'яўляецца імкненне да творчасці, жаданне спасцігнуць таямніцы прыроды. Праз жывапіснасць паэтычнага радка вучні далучаюцца да хараства роднай прыроды, пачынаюць па-іншаму глядзець на гісторыю, на сённяшні дзень свайго краю.

З V па XI класы вядзецца вывучэнне канкрэтных твораў М. Багдановіча. Сярод іх вершы «Зімой», «Вадзянік», «Па-над белым пухам вішняў...», «Слуцкія ткачыхі», «Раманс» («Зорка Венера ўзышла над зямлёю...»), «Кніга», «Лясун», «Маладыя гады», «Пагоня», «Тэрцыны», «Трыялет» («Мне доўгае расстанне з Вамі...»), «Змяіны цар», «Падвей», «Летапісец», «Жывеш не вечна, чалавек...», паэмы «Страцім-лебедзь» і «У вёсцы», вершаванае апавяданне «Вераніка», апавяданні «Апокрыф» і «Апавяданне аб іконніку і залатару». Жанравая і формавая палітра гэтых твораў даволі разнастайная, тэматычны дыяпазон надзвычай шырокі. Калі ў V–VII класах вывучаецца толькі па адным вершы паэта, то, пачынаючы з VIII класа, іх колькасць значна павялічваецца. У выніку за гады навучання ў школе дзеці шматбакова знаёмяцца з творчай спадчынай класіка. Гэтаксама абапіраючыся на творы М. Багдановіча, настаўнік у больш даступным для дзяцей ракурсе падае звесткі з тэорыі літаратуры, праводзіць паралель паміж набыткамі беларускай і замежнай літаратур, дапамагае вучням зразумець, якое месца займае беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай літаратуры.

Вершы М. Багдановіча гучаць як на класных, так і на агульнашкольных мерапрыемствах. Гэта святы, якія праводзяцца не толькі ва ўрачыстыя дні (у дзень народзінаў ці з нагоды іншага юбілею паэта), але і тыя, што з'яўляюцца агульнанацыянальнымі і міжнароднымі святамі. Падобныя мерапрыемствы, маючы добры патэнцыял для маральна-эстэтычнага выхавання, садзейнічаюць трываламу засваенню твораў класіка.

Адзін з улюбёных вобразаў беларускай класічнай літаратуры, у тым ліку М. Багдановіча, як і адна з актуальных тэм сучаснага багдановічазнаўства, – вобраз Маці, тэма жаноцкасці і мацярынства. Так, 14 кастрычніка адзначаецца Дзень Маці. На свяце настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, якую ролю ў жыцці чалавека паэт адводзіў маці. Марыя Апанасаўна Мякота вельмі рана пайшла з жыцця, але яна назаўжды засталася для Максіма «ўвасабленнем найвышэйшага, амаль неспасціжанага хараства, а таксама ахвярнасці дзеля малога дзіцяці» [10, с. 7]. «Аўтабіяграфічныя факты былі моцным стымулам у стварэнні жаночых вобразаў» [6, с. 60] у лірыцы Максіма Багдановіча. Прызначэнне жанчыны «ён бачыць у мацярынстве, выхаванні дзяцей, у самаахвярнай любові да іх і мужа» [5, с. 25].

Калі ў падлеткавым узросце ў большасці вучняў пачуццё закаханасці выходзіць на адно з першых месцаў, варта расказаць ім, якімі ўяўляў адносіны паміж закаханымі Максім-юнак, як кахаў ён сам. «Жанчына з'яўляецца аб'ектам

захаплення і пакланення, але яна недасягальная і велічная, як далёкая зорка» [6, с. 64] – гэтаю думкаю прасякнуты лірычныя вершы паэта. Па творах М. Багдановіча можна лёгка зразумець, якія пачуцці павінны валодаць і валодаюць закаханым. Гэта адчуваць радасць ад таго, што бачыш каханую, гаворыш з ёю. Адносіцца да дзяўчыны з павагай і пяшчотай. Схіляцца перад яе далікатнасцю і чысцінёю. Паважаць у ёй будучую маці. Таму да Дня закаханых (14 лютага) вучні старшых класаў, натхніўшыся паэтычнымі гімнамі каханню, ствараюць уласныя вершы. У творчасці маладых заключаецца важны выхаваўчы момант. Калі ў сучасным свеце ўяўленні аб каханні нельга назваць узнёслымі і яны не адпавядаюць традыцыям сусветнай і беларускай класікі, то ў падлеткаў фарміруецца скажона-прыземлены, выключна спажывецкі падыход да гэтага пачуцця. Творы класіка беларускай літаратуры дапамагаюць вучням аднавіць раўнавагу матэрыяльнага і ідэальнага, прыземленага і ўзнёслага, фізічнага і духоўнага, больш дакладна зразумець душэўны стан чалавека, які кахае.

«Яшчэ адным аспектам увасаблення Вечнай жаноцкасці ў творчасці паэта становіцца матыў Беларусі-жанчыны» [9, с. 132]. Сваю радзіму М. Багдановіч параўноўвае з жанчынай-маці, якая любіць усіх сваіх дзяцей, жадае ім дабра, а дзеці, у сваю чаргу, абавязаны клапаціцца пра лёс маці-радзімы, бараніць яе. У вершах паэт «як бы вядзе дыялог са слаўнай гісторыяй» [3, с. 53] Беларусі. Гэтыя думкі класіка павінны агучвацца на нацыянальных Беларускіх святах, напрыклад, у Дзень беларускага Гімна і Сцяга, у Дзень Перамогі.

Значную ролю ў выхаванні сучасных школьнікаў займаюць музеі. Таму супрацоўніцтву музея з вучэбна-выхаваўчым працэсам у школе ўдзяляецца дастатковая ўвага як з боку метадыстаў, так і з боку настаўнікаў. Менавіта Літаратурны музей Максіма Багдановіча з`яўляецца цудоўным памочнікам школы ў справе выхавання новых пакаленняў, дапамагае ўсебакова раскрыць таямнічы, непаўторны свет беларускага песняра. Выкарыстоўваючы фонды музея, настаўнік знаёміць дзяцей з тымі момантамі жыцця і творчасці М. Багдановіча, што знаходзяцца па-за межамі школьнай праграмы. «Усё набывае своеасаблівую трактоўку» [4, с. 52], калі САМ «спрабуеш разгадаць «загадку Багдановіча» [4, с. 52]. Вучань не можа застацца абыякавым, калі на ўласныя вочы бачыць «лісты, почырк паэта, прадметы, да якіх ён дакранаўся» [4, с. 53]. Убачанае, пачутае прымушае думаць, разважаць, яно адначасова развівае лагічнае мысленне, мову, творчыя здольнасці дзяцей. «Адкрыццё новых старонак жыцця пісьменніка» [4, с. 53] выклікае цікавасць да больш падрабязнага вывучэння яго творчасці і можа стаць асновай «да далейшай пошукавай працы» [4, с. 53]. Таму «вывучэнне творчасці М. Багдановіча з выкарыстаннем сродкаў музея» [4, с. 54] – вельмі важны кірунак адукацыйнага працэсу.

Для правядзення інфармацыйных гадзін у школе настаўнікі выкарыстоўваюць публікацыі ў сродках масавай інфармацыі пра падзеі, звязаныя з ушанаваннем памяці М. Багдановіча. На мерапрыемствах, якія адбываюцца ў Тыдзень беларускай пісьменнасці і друку, гучаць вершы, расказваецца пра нялёгкі жыццёвы шлях паэта. Творы М. Багдановіча не сыходзяць са старонак школьных падручнікаў. У гонар песняра ладзяцца літаратурныя вечарыны, праводзяцца

кіналекторыі, сустрэчы з паэтамі і празаікамі – прадстаўнікамі "малой радзімы" – Беларусі. Яго вершы гучаць у выкананні майстроў сцэны – на ўроках і на святочных мерапрыемствах. Яны натхняюць, прымушаюць думаць, хвалююць душы падрастаючага пакалення.

І радуецца сэрца неабыякавага беларуса ад таго, што больш за век таму назад на нашай зямлі з'явілася і ярка замігцела новая, вялікая зорка на небасхіле сусветнай літаратуры. І імя гэтай зоркі – МАКСІМ БАГДАНОВІЧ.

**Літаратура:**

1. Адамовіч, Г. Максім Багдановіч – паэт-жывапісец, паэт-музыка / Г. Адамовіч // Адамовіч, Г. З крыніц сусветнай літаратуры : Дапам. для настаўнікаў. – Мінск : БелЭн., 1998. – С. 42–50.

2. Барсток, М.М. Максім Багдановіч у школе / М.М. Барсток. – 3-е выд. – Мінск : Народная асвета, 1991. – 109 с.

3. Бурбоўская, А. Паэт нараджаецца не аднойчы… ці Значэнне творчасці Максіма Багдановіча ў развіцці беларускай літаратуры / А. Бурбоўская // Зборнік дакладаў: матэрыялы дакладаў і паведамленняў Міжнар. навук.-практ. канф. "Максім Багдановіч і іншанацыянальныя літаратуры", Мінск, 2001 г. / Літ. музей М. Багдановіча ; рэдкал. : І.І. Думанская [і інш.], уклад. І.В. Мышкавец. – Мінск : Літаратурны музей Максіма Багдановіча, 2003. – С. 47–59.

4. Грынько, С. Выкарыстанне сродкаў музея пры вывучэнні творчасці Максіма Багдановіча / С. Грынько // Максім Багдановіч і яго эпоха : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 27 лістап. 2007 г. / Літ. музей М. Багдановіча ; рэдкал. : М.В. Трус [і інш.], уклад. І.В. Мышкавец. – Мінск : РІВШ, 2009. – С. 50–54.

5. Драздова, З. Пошукі жаночага ідэалу ў творчасці Максіма Багдановіча і сучасных беларускіх паэтаў / З. Драздова // Максім Багдановіч і сучасны літаратурны працэс : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 100-годдзю першых публікацый вершаў Максіма Багдановіча, Мінск, 27 ліст. 2009 г. ; Максім Багдановіч і яго акружэнне на хвалях першай сусветнай вайны : музейныя чытанні, прысвеч. 95-годдзю Мінскага аддзела Беларускага таварыства па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны, Мінск, 10 снеж. 2010 г. / Літ. музей М. Багдановіча ; рэдкал., В.П. Рагойша [і інш.], уклад. К.А. Кандрацёнка. – Мінск : РІВШ, 2011. – С. 24–29.

6. Калядка, С. Жаночыя вобразы ў паэзіі Максіма Багдановіча : гендэрны аспект / С. Калядка // Максім Багдановіч і яго эпоха : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 27 лістап. 2007 г. / Літ. музей М. Багдановіча ; рэдкал.: М.В. Трус [і інш.], уклад. І.В. Мышкавец. – Мінск : РІВШ, 2009. – С. 60–65.

7. Козіч, В. Максім Багдановіч у студэнцкай аўдыторыі : да праблемы ўспрыняцця / В. Козіч // Максім Багдановіч і сучасны літаратурны працэс : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 100-годдзю першых публікацый вершаў Максіма Багдановіча, Мінск, 27 ліст. 2009 г. ; Максім Багдановіч і яго акружэнне на хвалях першай сусветнай вайны: музейныя чытанні, прысвеч. 95-годдзю Мінскага аддзела Беларускага таварыства па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны, Мінск, 10 снеж. 2010 г. / Літ. музей М. Багдановіча ; рэдкал., В.П. Рагойша [і інш.], уклад. К.А. Кандрацёнка. – Мінск : РІВШ, 2011. – С. 41–44.

8. Ляшук, В.Я. Вывучэнне творчасці Максіма Багдановіча ў школе: дапам. для наст. / В.Я. Ляшук. – Мінск : Аверсэв, 2008. – 255 с.

9. Пыско, Н. Увасабленне ідэі вечнай жаноцкасці ў творчасці Максіма Багдановіча / Н. Пыско // Максім Багдановіч і яго эпоха : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 27 лістап. 2007 г. / Літ. музей М. Багдановіча ; рэдкал.: М.В. Трус [і інш.], уклад. І.В. Мышкавец. – Мінск : РІВШ, 2009. – С. 128–134.

# ЗМЕСТ

## ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

*Л.П. Вашків, М.М. Данилевич (Тернопіль, Україна)*
**МАКСИМ БОГДАНОВИЧ І БІЛОРУСЬКА ЛІТЕРАТУРА У ДОСЛІДЖЕННЯХ ПРОФЕСОРА І.О. ДЕНИСЮКА** ........ 3

*А.М. Макарэвіч (Магілёў)*
**М. ДРАЙ-ХМАРА ЯК ДАСЛЕДЧЫК ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА** ........ 7

*М.І. Мішчанчук (Брэст)*
**БАГДАНОВІЧАЎСКІЯ ТРАДЫЦЫІ Ў ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСКАГА ЗАМЕЖЖА** ........ 15

*В.П. Рагойша (Мінск)*
**ПЕРАКЛАДЧЫЦКАЯ ТВОРЧАСЦЬ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА Ў СВЯТЛЕ МАТЫВАЦЫЙНАЙ ТЭОРЫІ МАСТАЦКАГА ПЕРАКЛАДУ** ........ 20

*М.А.Тычына (Мінск)*
**МАКСІМ БАГДАНОВІЧ – ТЭАРЭТЫК ЛІТАРАТУРЫ** ........ 26

*О.И. Федотов (Москва, Россия)*
**РУССКИЙ СОНЕТ МАКСИМА БОГДАНОВИЧА** ........ 29

*А.О. Шелемова (Москва, Россия)*
**БЕЗУПРЕЧНЫЙ СОНЕТ МАКСИМА БОГДАНОВИЧА** ........ 34

## ВЫСТУПЛЕННІ НА СЕКЦЫЯХ

*Г.Я. Адамовіч (Мінск)*
**“ЧАМУ У НАС АКАМЯНЕЛАСЦІ ДУХОЎНАЙ СТРАВАЮ ЗАВУЦЬ”: КЛАСІКА І ЯЕ ВЫМЯРЭННІ Ў ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА** ........ 39

*Р.А. Александровіч (Мінск)*
**“Ў КРАІНЕ СВЕТЛАЙ...”: КРЫМ У ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА** ........ 43

*Н.Я. Анапрэенка (Мінск)*
**МАКСІМ БАГДАНОВІЧ І ПОЛЬСКАЯ ЛІТАРАТУРА** ........ 47

*Н.М. Базар (Мінск)*
**СУЧАСНАЕ БАГДАНОВІЧАЗНАЎСТВА – ШКОЛЕ** ........ 51

*З.І. Бадзевіч (Мінск)*
**ПРЫМЕТНІКІ-КАЛЯРОНІМЫ Ў ПАЭЗІІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА** ........ 55